**Глускае раённае спажывецкае таварыства па выніках мінулага года па фінансавых паказчыках заняла 4-е месца ў вобласці і ўвайшло ў дзясятку найлепшых прадпрыемстваў краіны.**

# КАРЫСНЫЯ ПРЫСМАКІ

## Нашы чарніцы ведаюць нават у Амерыцы

### СЛАВУТЫ КОШЫК

Сёння Глускаму спажывецкаму таварыству належаць ні многа ні мала 47 гандлёвых аб'ектаў, 19 аб'ектаў грамадскага харчавання, хлебная пякарня, кандытарская, участак па вытворчасці рыбнай прадукцыі, мясных паўфабрыкатаў. Акрамя ўсяго іншага, таварыства займаецца вытворчасцю прадукцыі глыбокай замарозкі. Дарэчы, пра апошнюю: калі ў жыхароў Глуска спытаць, што вылучае гарадок сярод усіх іншых, то ў першую чаргу яны згадваюць не ўнікальнасць прыроды або архітэктуру, а называюць брэнд цэха замарозкі райспажыўтаварыства «Глускі кошык».


Юрысконсульт Глускага райспажыўтаварыства Ала ІЛЬЮШЧЭНЯ мае ганаровае званне «Чалавек года».

«І гэта сапраўды гучны брэнд, — расказвае юрысконсульт Глускага райспажыўтаварыства Ала Ільюшчэня. — У нашай краіне ўсяго 2 такія прадпрыемствы, што займаюцца замарозкай ягад і грыбоў». Дарэчы кажучы, Ала Ільюшчэня летась атрымала ганаровае званне «Чалавек года» ў намінацыі «Найлепшы юрыст». Вось ужо 9 гадоў яна працуе ў таварыстве і займаецца арганізацыяй прававога забеспячэння прадпрыемства. Сюды яна прыйшла якраз тады, калі пачынаў будавацца цэх замаразкі і ствараўся брэнд «Глускі кошык». Яна памятае, як няпроста было выбраць неабходнае абсталяванне і наколькі высокая была адказнасць.

### ЗАМАРОЗКА СПЕЦЫЯЛЬНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ

Па словах намесніка старшыні праўлення Глускага райспажыўтаварыства па гандлі Наталлі Талкачовай, на ўзвядзенне вялізнага «халадзільніка» было выдаткавана 10,5 мільярда рублёў. Вынік — створанае з нуля прадпрыемства, дзе ёсць італьянскае, шведскае і расійскае абсталяванне, якое адпавядае ўсім сучасным патрабаванням. У 2007-м узводзіўся будынак цэха, а ўжо праз год «Глускі кошык», умоўна кажучы, да краёў напоўніўся замарожанымі ягадамі і грыбамі. Прадукцыйная магутнасць тэхналагічнай лініі складае 2 тоны глыбокай замаразкі ягад у гадзіну. У цэху модульнага тыпу таксама ўведзены ў дзеянне пяцісекцыйны халадзільнік на 500 тон. Тут перапрацоўваюць і замарожваюць маліны, чырвоныя і чорныя парэчкі, агрэст, журавіны і іншыя ягады, якія растуць у Беларусі, а таксама грыбы з нашых лясоў. Райспажыўтаварыства таксама аказвае паслугі па замарозцы і захоўванні прадукцыі. А ў асноўным цэх працуе сезонна — фактычна толькі 4 месяцы на год. Цяпер стаіць пытанне круглагадовай загрузкі цэха, каб замарожваць не толькі грыбы і ягады, але і розную гародніну. Для гэтага трэба пабудаваць дадатковую вытворчасць, закупіць яшчэ адну высокатэхналагічную лінію.

А пакуль што лета — тут насамрэч самая гарачая пара. Людзі круглыя суткі нарыхтоўваюць ягады: сартуюць, мыюць і замарожваюць. Прычым адбіраюць толькі самыя якасныя. Усе ягады праходзяць працэдуру «шокавай замарозкі», пры гэтым у іх захоўваецца да 90% вітамінаў, а пасля размарожвання прадукт не губляе формы і смаку.

Уся прадукцыя «Глускага кошыка» прадстаўлена на прылаўках краіны. Таксама брэнд можна ўбачыць у Расіі і нават у ЗША. У Амерыцы ягады і грыбы прадпрыемства карыстаюцца павышаным попытам, але дастаўляць іх туды пакуль што праблематычна. У цэлым за 2015 год на экспарт адгружана каля 600 тон прадукцыі — у асноўным на Польшчу і Латвію.

### ЯГАДЫ КРУГЛЫ ГОД

Прадпрыемства паспяхова нарыхтоўвае лішкі сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі ў насельніцтва. Гэта дазваляе эфектыўна загрузіць магутнасці цэха па замарозцы, ды і зарабіць мясцовым жыхарам. За 2015 год нарыхтавана такой прадукцыі на суму 11,5 мільярда рублёў, што эквівалентна 1,6 млн рублёў на аднаго сельскага жыхара. Такім чынам, прагнознае заданне выканана на 106%, тэмп росту закупак склаў 163%. Найбольш паспяхова за мінулы год нарыхтоўвалася дзікарослая прадукцыя (216 тон), што вышэй за паказчык 2014 года ў 4,3 раза. Дзякуючы такой працы, свежыя ягады і грыбы жыхары Беларусі могуць паспытаць круглы год, а самае важнае — па прымальных цэнах. Уся прадукцыя фасуецца ў упакоўку на 450 грам. Без уліку ПДВ за адну порцыю хутказамарожаных чарніц неабходна аддаць прыблізна 24 тысячы рублёў, суніц — 20 тысяч рублёў, вішань — 17 тысяч, чорных і чырвоных парэчак — 11 тысяч, агрэсту — 19 тысяч, малін — 27 тысяч, журавін — 28 тысяч і брусніц — 21 тысячу рублёў. Грыбы фасуюцца ў вядро па 2 кг. На порцыю апенек вы выдаткуеце без ПДВ 74 тысячы рублёў. Больш падрабязна азнаёміцца з актуальнымі цэнамі на прадукцыю «Глускага кошыка» зможаце, калі наведаеце сайт фірмы (http://glusk-lukoshko.by). Там жа вы зможаце даведацца, дзе менавіта можна набыць замарожаныя грыбы і ягады непадалёк ад вашага месца жыхарства.


Брэнд цэха замарозкі райспажыўтаварыства «Глускі кошык» вядомы далёка за межамі раёна.

### ХЛЕБ ТУТ ПАВАЖАЮЦЬ

Асобна хочацца расказаць і пра хлеб, які выпякаюць на прадпрыемстве Глускага райспажыўтаварыства. Да яго тут ставяцца з асаблівым клопатам. Наталля Талкачова патлумачыла, што за якасцю хлебабулачнай прадукцыі ў раёне сачылі заўсёды вельмі добра. Штодзень яго дастаўляюць у розныя, нават самыя цяжкадаступныя з лагістычнага пункту гледжання, месцы. І нават калі ў суседніх вёсках жыве некалькі чалавек, свежы хлеб прывязуць своечасова. Разнастайнасць хлебабулачнай прадукцыі таксама здзівіла — тут смачна пякуць і звыклыя для сталічнага жыхара кексы і круасаны.

Прылаўкі мясцовых магазінаў заўсёды гатовыя задаволіць попыт любога пакупніка не толькі хлебам, але і іншай прадукцыяй. Тут з гэтым строга — прадукты заўсёды павінны быць у разнастайнасці і свежымі. Штогод у спажывецкім грамадстве задумваюцца аб пашырэнні сваіх плошчаў, бо прыходзіцца забяспечваць патрэбы ўсіх жыхароў раёна. А гэта магчыма дзякуючы зладжанай працы. Летась райспажыўтаварыства за свае сродкі пабудавала новую краму. І сёлета плануецца ўвесці ў дзеянне патрэбныя людзям аб'екты.

**Карысны адрас:**
г.п. Глуск,
вул. К. Маркса, 6.
Тэл. 8-02230-41-668.

УНП 700100651

**Жыхароў Глускага раёна якасна вадой і цяплом забяспечвае прадпрыемства «Жылкамгас». Тут працуюць высокакваліфікаваныя кадры, якія займаюцца шырокім спектрам работ: ад добраўпарадкавання вуліц і пасадкі дрэў да мадэрнізацыі ацяпляльных сістэм і рамонту водаправода. Менавіта на базе гэтай арганізацыі ЖКГ упершыню быў усталяваны ацяпляльны кацёл, які працуе на саломе. Дарэчы, тут жа сваімі намаганнямі яго сёлета паспяхова мадэрнізавалі.**

# Камунальныя стасункі

## Анатомія эканомнага цяпла


Намеснік дырэктара Леанід ТРЫБУШ разам з аператарам кацельні Сяргеем ЛУГІНЫМ і слесарам-рамонтнікам Андрэем ЛУГІНЫМ праводзяць праверку стана катла.

### І РАМОНТ ЗРОБЯЦЬ, І ДРЭВЫ ПАСАДЗЯЦЬ

Па словах дырэктара Глускага жылкамгаса Юрыя Дымшы, прадпрыемства было створана загадам упраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама 18 лютага 1982 года.

Сёння гэта шматпрофільная арганізацыя, дзе прафесіяналы сваёй справы ажыццяўляюць работы па эксплуатацыі і рамонту жыллёвага фонду, прывядзенні ў належны стан аб'ектаў гарадскога добраўпарадкавання. Работнікі сферы ЖКГ таксама адказваюць за якаснае забеспячэнне спажыўцоў вадой, цеплаэнергіяй і іншымі відамі камунальных паслуг.

«У прадпрыемстве сфарміраваліся структурныя падраздзяленні вытворчай сістэмы, — распавёў галоўны інжынер Глускага жылкамгаса Аляксандр Лугін, — і да іх цяпер належыць водаправод працягласцю 186,8 км, 58 артэзіянскіх свідравін, 32 воданапорныя вежы, таксама каналізацыя працягласцю 54,8 км з 20 каналізацыйна-помпавымі станцыямі і 14 ачышчальнымі збудаваннямі. Акрамя ўсяго іншага, сюды ж уваходзяць кацельная гаспадарка з 29 кацельнямі сумарнай магутнасцю 37,96 Гкал/г, аўтагаспадарка і падраздзяленне па лесанарыхтоўцы і дрэваапрацоўцы».


Дырэктар Глускага жылкамгаса Юрый ДЫМША.

Менавіта такімі сіламі жылкамгас абслугоўвае жыллёвы фонд раёна (191 дом), лазню і гасцініцу. У сферу дзейнасці ўваходзяць прыём і перапампоўванне сцёкавых вод, забеспячэнне працы кацельняў, ямачны рамонт і разметка вуліц, догляд помнікаў славы. Акрамя таго, маюць сертыфікаты на агульнабудаўнічыя і сантэхнічныя работы, якія дазваляюць праводзіць капітальны рамонт. Таксама прадастаўляюць рытуальныя паслугі для насельніцтва. Вясной і восенню займаюцца пасадкай дрэў. Дарэчы, не так даўно пасадзілі 110 дрэў у Глуску і больш за 100 на вёсцы. Летась да сямідзесяцігоддзя святкавання Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне заклалі сад з 70 яблынь, які сёння ўпрыгожвае цэнтр Глуска.

Напэўна, менавіта Глуск стаў адным з тых месцаў, дзе ўзімку адчулі ўсю сілу цыклона «Даніэла» больш за астатніх. Прадстаўнікі жылкамгаса былі, што называецца, на пярэднім краі змагання са стыхіяй. Супрацоўнікі прадпрыемства добра прайшлі праверку на трываласць. Аднак у тутэйшых лясах дагэтуль прыбіраюць той беспарадак, які паспела нарабіць стыхія ўсяго за пару дзён. Сіламі арганізацыі для мясцовага лясгаса нарыхтоўваецца дзелавая драўніна.

Летась прадпрыемства пасля рэканструкцыі адкрыла гарадскую лазню — усё зроблена на высокім узроўні. Думаюць і пра тое, як развівацца на перспектыву, бо насельніцтву патрэбны новыя паслугі. Цяпер прадпрыемства рыхтуе цэх па вытворчасці вокнаў ПВХ.

Аляксандр Лугін таксама расказаў, што асаблівую ўвагу Глускі жылкамгас надае пытанням энергазберажэння, бо бюджэтныя сродкі трэба эканоміць.

«Сёння перад прадпрыемствам стаіць пытанне аб жорсткім скарачэнні выдаткаў. Зараз мы пераводзім нашы аўтамабілі на газ, рэгулюем паліўную апаратуру, аптымізуем колькасць штату. Па праграме энергазберажэння ўкараняюцца святлодыёдныя свяцільнікі. Ставім новыя катлы ацяплення. Кожны артыкул выдаткаў дэталёва вывучаецца», — растлумачыў галоўны інжынер.


Аляксандр ЛУГІН, галоўны інжынер Глускага жылкамгаса.

### З САЛОМЫ НА ТРЭСКІ

Намеснік дырэктара Леанід Трыбуш паведаміў, што каля 50% выручкі арганізацыя атрымлівае за кошт пастаўкі цяпла падчас ацяпляльнага сезона. Крыху больш за палову ад сумарнай магутнасці 20 Гкал/г належыць 2-м камбінаваным кацельням прадпрыемства, якія працуюць і на газе і на мясцовых відах паліва (МВП). Астатнія 17,46 Гкал/г прыпадаюць на 27 кацельняў, якія працуюць выключна на МВП. Доля мясцовых відаў паліва ў структуры кацельна-пячнога паліва летась склала 98,4% пры заданні 95,5%. У цэлым за мінулы год арганізацыя на сваіх магутнасцях выпрацавала больш за 32 тысячы Гкал цяпла.

Менавіта ў Глуску пачаў працаваць першы ў Беларусі ацяпляльны кацёл, які выкарыстоўвае ў выглядзе паліва салому. Ён зроблены на гомельскім прадпрыемстве, а яго магутнасць складае 2 МВт. Цікавы факт, што ў літры дызельнага паліва і ў 2,5 кг саломы, аказваецца, прыкладна аднолькавая колькасць энергіі. Штогод тут нарыхтоўваюць каля дзвюх тысяч тон саломы на ўвесь ацяпляльны сезон. Прынцып працы кацельнага комплексу просты — салома, як у кавамолку, трапляе ў драбнілку побач з катлом, затым пневматранспартам падаецца ўнутр. Ужо пасля спецыяльныя транспарцёры даставаюць салому ў кацельнае памяшканне, дзе яна згарае.

Сёлета кацёл вырашылі адаптаваць яшчэ і на працу за кошт трэсак, бо ў Глускім раёне лясістая мясцовасць і тут шмат драўніны. Гэта ў прадстаўнікоў жылкамгаса паспяхова атрымалася зрабіць за кошт сваіх сіл і ўменняў.

**Карысны адрас:**
Магілёўская вобласць,
Глускі раён,
вул. Луначарскага, 36
Кантактны тэлефон
802230 42439

УНП 700100279